УДК 903’1(476-15)“634”:903.02

***С.С. Юрэцкі***

*магістр гіст. навук, аспірант 3 года навучання*
*аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

# МЕСЦА СУПОЛЬНАСЦЕЙ ЛЯСНОГА НЕАЛІТУ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ Ў СІСТЭМЕ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ (ПРЫКЛАД КЕРАМІКІ)

*У артыкуле разглядаецца праблема ўдзелу супольнасцей лясного неаліту ў сістэме культурных сувязей на тэрыторыі Беларускага Панямоння. Закранаюцца пытанні ўзаемадачыненняў старажытнага насельніцтва, якое з’яўлялася носьбітам мясцовых прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур з прышлымі традыцыямі цэнтральнаеўрапейскага неаліту (культуры лейкападобных кубкаў, шарападобных амфар і шнуравой керамікі). Таксама асвятляецца праблематыка прысутнасці ў рэгіёне ўплываў з боку суседніх супольнасцей лясного неаліту (галоўным чынам нарвенскага асяродку). Даследаванне заснавана на разглядзе керамікі як важнейшай крыніцы ў працэсе вывучэння старажытных супольнасцей. На прыкладзе ўсебаковага аналізу керамічных матэрыялаў устаноўлены іншакультурныя азнакі, якія з’яўляюцца сведчаннем пранікнення яго ўплыву ў лясны неаліт рэгіёна. Такія прыметы выяўлены пераважна сярод марфалагічных і арнаментацыйных паказчыкаў керамікі. З тэхналагічнага пункту гледжання адметныя матэрыялы з дамешкамі таўчоных ракавінак, што не з’яўляецца характэрнай з’явай для эпохі неаліту на тэрыторыі рэгіёна.*

## Уводзіны

Аналіз керамікі супольнасцей лясного неаліту з тэрыторыі Беларускага Панямоння дазваляе вылучыць шэраг культурнавызначальных паказчыкаў, якія з’яўляюцца сведчаннямі ўплыву з боку як цэнтральнаеўрапейскага аграрнага неаліту, так і суседніх усходнееўрапейскіх культур. З пэўнымі дапушчэннямі атрыманыя даныя неабходна разглядаць у якасці крыніц па асвятленні лёсу мясцовага насельніцтва ў перыяд з 5 па пачатак 2 тысячагоддзя да н.э. Неабходнасць разгляду дадзенай праблематыкі неаднаразова падымалася ў навуковай літаратуры і з’яўляецца адной з асноўных праблем у вывучэнні старажытнасцей эпохі неаліту ў Беларускім Панямонні на сучасным узроўні даследаванняў [15–17].

Дадзены артыкул прысвечаны адзнакам культурных уплываў на прыкладзе керамічных калекцый. Менавіта кераміка з’яўляецца асноўнай крыніцай у працэсе вывучэння супольнасцей лясного неаліту на тэрыторыі Беларусі, вызначэння іх храналогіі і перыядызацыі, а таксама культурнай ідэнтыфікацыі [8, с. 48–67].

## Уплывы з боку цэнтральнаеўрапейскага неаліту

У якасці сведчанняў уздзеяння на мясцовы лясны неаліт вылучаюцца прыметы наступных культур, што традыцыйна адносяцца да цэнтральнаеўрапейскага аграрнага неаліту: культуры лейкападобных кубкаў, культуры шарападобных амфар, а таксама кола культуры шнуравой керамікі.

На прысутнасць старажытнасцей культуры лейкападобных кубкаў на тэрыторыі сучаснай Паўночна-Заходняй Беларусі ўказвалася яшчэ ў навуковых публікацыях міжваеннага часу [18; 19]. Аднак у сучасных даследаваннях маюцца толькі няпэўныя сведчанні існавання артэфактаў, якія звязваюцца з дадзенай супольнасцю і паходзяць з рэгіёна Беларускага Панямоння [3; 22]. Сярод патэнцыяльных паказчыкаў уплыву традыцый культуры лейкападобных кубкаў на мясцовае насельніцтва супольнасцей лясного неаліту пераважна разглядаюцца дамешкі шамоту ў гліняным фармовачным цесце,

---

Навуковы кіраўнік – В.Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, намеснік дырэктара па навуковай працы Інстытута гісторыі НАН Беларусі

гладкасценнасць керамікі, арнаментацыя ў выглядзе лінейнага штампу, а таксама адметнасці марфалогіі, якія праявіліся ў вылучэнні шыйкі і S-падобнай прафіліроўкі пасудзін [22, s. 134–136]. Пагаджаючыся з А. Ваўрусевічам, адзначым, што дамешкі шамоту ў якасці сведчанняў уплыву з боку «лейкападобнікаў» могуць разглядацца досыць умоўна і скептычна [22, s. 135]. Доказам гэтаму служаць тэхналагічныя асаблівасці ранненеалітычнай керамікі прыпяцка-нёманскай культуры [10, с. 146].

Больш надзейнымі азнакамі культуры лейкападобных кубкаў на кераміцы прыпяцка-нёманскай культуры з'яўляюцца адбіткі лінейнага штампу [10, с. 147]. На раннім этапе нёманскай культуры пашыраецца аздабленне ў выглядзе лінейнага штампу, а таксама загладжанасць знешніх паверхняў, вылучэнне шыйкі і S-падобнай прафіліроўкі ў вастрадонных пасудзін [8, с. 58–59; 14].

Сярод усяго масіву прыпяцка-нёманскай культуры ў Беларускім Панямонні толькі нешматлікія фрагменты керамікі арнаментаваны ў выглядзе стылізаванага нахіленага лінейнага штампа у т.зв. «скарапіснай манеры». Больш прадстаўнічыя па колькасці матэрыялы зафіксаваны на раннім этапе нёманскай культуры, а таксама на больш позняй кераміцы класічнага этапу названай супольнасці. Адзначым таксама пакуль праблемны характар інтэрпрэтацыі тэкстыльных адбіткаў на такой кераміцы [8, с. 59].

Вызначальным для керамікі ранняй нёманскай культуры з'яўляецца загладжанасць знешніх паверхняў керамікі, а таксама ўнутраных у верхніх частках пасудзін, наяўнасць вылучанай адагнутай шыйкі, якая надае S-падобную прафіліроўку. Такія прыметы маглі з'явіцца ў Беларускім Панямонні, найбольш верагодна, толькі з боку культуры лейкападобных кубкаў [8, с. 58–59]. Згодна М. Шмыт, названыя паказчыкі ў керамічных матэрыялах адпавядаюць т.зв. «сінкрэтычным» формам прысутнасці традыцыі згаданай культуры ў мясцовым асяроддзі лясной зоны Усходняй Еўропы [21, p. 111]. Такія культурныя імпульсы маглі перадавацца не толькі непасрэдна, але і апасродкавана праз носьбітаў іншых культур, якія непасрэдна суіснавалі з «лейкападобнікамі». У выпадку лясного неаліту Беларускага Панямоння такая перадача традыцый магла адбывацца праз супольнасці Заходняга Палесся [2; 4], Падлясся [23–25], а таксама праз насельніцтва Беларускага Пабужжа [7].

Дакладная прысутнасць носьбітаў цэнтральнаеўрапейскай традыцыі аграрнага неаліту адзначана для культуры шарападобных амфар, старажытнасці якой непасрэдна зафіксаваныя на тэрыторыі Беларускага Панямоння [1; 9; 21]. Асноўнымі паказчыкамі ўздзеяння «шарападобнікаў» на мясцовую нёманскую культуру з'яўляюцца элементы арнаментацыі ў выглядзе лінейнага штампу, а таксама трубчастага аздаблення («адбіткі птушынага пяра») (малюнак, паз. 3, 4) [1, с. 11; 21, fig. 44: 2].

У дачыненні да фіксацыі на тэрыторыі Беларускага Панямоння азнак «шарападобнікаў» у асяроддзі мясцовага насельніцтва супольнасцей лясного неаліту паўстае праблема своеасаблівага перакрыжавання традыцый культур шарападобных амфар і шнуравой керамікі [1, с. 12]. Для класічнага этапу нёманскай культуры аб верагодным уплыве непасрэдна культуры шарападобных амфар можна гаварыць толькі ў дачыненні да керамікі, для якой з'яўляецца адметным адсутнасць падштрыхоўкі знешняй паверхні (малюнак, паз. 1–4). Для больш позніх керамічных матэрыялаў дабраборскай традыцыі распаўсюджванне элементаў аздаблення ў выглядзе лінейнага штампу і трубчастага аздаблення магло адбывацца апасродкавана праз носьбітаў кола культуры шнуравой керамікі, лакальныя групы якой і пазначаны А.У. Вайтовіч (Зуевай) як асноўныя пасрэднікі ў перадачы такіх прымет [1, с. 17].

У вызначэнні ролі насельніцтва, якое з'яўлялася носьбітам кола культур шнуравой керамікі, на нёманскую культуру на яе класічным этапе развіцця істотнае значэнне мае разгляд такога элемента апрацоўкі знешняй паверхні, як падштрыхоўка (малюнак, паз. 5). М.М. Чарняўскім выказвалася думка аб тым, што такі спосаб праціранне паверхні

быў пераняты мясцовым насельніцтвам верагодна ад «шнуравікоў» [10, с. 153]. В.Л. Лакіза, наадварот, разглядае падштрыхоўку як азнаку ўплыву нёманскай культуры на Падгорнаўскую групу помнікаў кола культуры шнуравой керамікі ў Панямонні [6, с. 152].



**Малюнак. – Кераміка класічнага этапу нёманскай культуры з помніку Лысая Гара (па матэрыялах даследаванняў М.М. Чарняўскага, 1965 г.)**

Больш паглыблены разгляд дадзенай праблематыкі дазваляе схіліцца да пункту гледжання аб першасным уплыве носьбітаў кола культуры шнуравой керамікі на мясцовае насельніцтва ляснога неаліту, у выніку чаго і быў пераняты звычай падштрыхоўкі (пучком травы?) знешніх паверхняў начынняў. Па-першае, традыцыі праціранне паверхні пучком травы зафіксаваныя ў найбольш ранніх фазах развіцця кола культуры шнуравой керамікі ў Цэнтральнай Еўропе, дзе падобным спосабам апрацоўваліся пераважна буйныя амфары, а таксама, хоць і ў меншай ступені, кубкі [20, s. 127]. Па-другое, падштрыхоўка паверхні пасудзін, якая ўтваралася ў выніку загладжвання, з’явілася ў асяроддзі нёманскай культуры не толькі ў Панямонні, але і ў Заходнім Палессі [2], а таксама на тэрыторыі Польшчы [23]. Гэтыя факты сведчаць пра наяўнасць пэўнага моцнага культурнага імпульсу, што выклікаў перамены на такой значнай тэрыторыі. У пазначаны перыяд такім імпульсам, найбольш верагодна, магло быць распаўсюджванне традыцый кола культуры шнуравой керамікі. Па-трэцяе, храналагічныя паказчыкі сведчаць пра пэўную адначасовасць з’яўлення ў Беларускім Панямонні старажытнасцей агульнаеўрапейскага А-гарызонту шнуравой керамік (з другой чвэрці 3 тысячагоддзя да н.э.) [5, с. 173] і керамікі з падштрыхоўкай знешняй паверхні (матэрыялы дабраборскай традыцыі) (з другой чвэрці / сярэдзіны 3 тысячагоддзя да н.э.) [11, с. 109].

Культурны імпульс з боку «шнуравікоў», відавочна, моцна змяніў асяроддзе мясцовага насельніцтва нёманскай культуры, што выклікала пэўную дыферэнцыяцыю ў яе развіцці. З аднаго боку, прадстаўлена кераміка, для якой характэрна выразная падгарызантальная падштрыхоўка і далейшае развіццё цэнтральнаеўрапейскіх прымет у спосабах стылістыкі пасудзін. З другога боку, фіксуецца існаванне некласічных матэрыялаў нёманскай культуры, якія хоць і ўтрымліваюць сляды падштрыхоўкі, але сумяшчаюць яго з даволі архаічным на той момант спосабам дабаўкі валакністай арганікі («расліннасці») у фармовачнае цеста. Такія факты гіпатэтычна тлумачацца тым, што частка на-

сельніцтва магла падкрэслівасць сваю адметнасць у параўнанні з распаўсюджваннем у іх асяроддзі «элітарных» азнак шнуравой керамікі.

**Уздзеянне супольнасцей ляснога неаліту**

Меньш адметнымі выглядаюць сведчанні ўздзеяння на кераміку прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур з боку традыцый суседніх супольнасцей ляснога неаліту. Такія ўплывы ў першую чаргу праявіліся ў існаванні нарвенскага/постнарвенскага культурнага кампаненту ў лясным неаліце Беларускага Панямоння [17, с. 72]. Сам факт існавання керамікі нарвенскага тыпу з таўчонымі ракавінкамі ў цесце на тэрыторыі рэгіёна сведчыць пра кантакты насельніцтва двух вялікіх культурных асяродкаў: нёманскага і нарвенскага. Аднак застаецца пад пытаннем ступень такога ўздзеяння. Фактычна згаданы ўплыў праявіўся толькі ў матэрыялах на помніку Дакудава–5, наяўнасці стылізаванай выявы качкі на кераміцы з помніка Русаковічы–9 [13, с. 116, мал. 2] і, магчыма, нешматлікіх вусеневых узорах на матэрыялах з вярхоўяў Нёмана [12, с. 68–69].

У якасці азнак суседніх культур ляснога неаліту апісваліся таксама лапчастыя адбіткі на кераміцы. Аднак дадзеныя фрагменты досыць нешматлікія, хоць і з'явіліся тут, верагодна, у выніку кантактаў з носьбітамі верхнедняпроўскай культуры [8, с. 60].

Як сведчанні магчымага ўплыву з боку традыцый ляснога неаліту разглядаюцца ямкавыя ўціскванні на тшцінецкай кераміцы [8, с. 78, 83]. Аднак дадзеная праблема яшчэ далёкая ад свайго вырашэння і вымагае сумесных кансультацый і даследаванняў спецыялістаў па неаліце і раннім бронзавым веку. Пад пытаннем застаецца і вызначэнне самаго характару з'яўлення керамікі сярод насельніцтва лясной зоны Усходняй Еўропы. На дадзеным этапе вывучэння найбольш верагоднай з'яўляецца гіпотэза, якую выказаў у свой час М.М. Чарняўскі, аб аўтахтонным характары зараджэння вырабу керамічных начынняў [11, с. 103].

Такім чынам, уплыў на насельніцтва супольнасцей прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур у Беларускім Панямоннні з боку суседніх традыцый ляснога неаліту ў параўнанні з цэнтральнаеўрапейскімі быў менш значным. Кераміка нарвенскага тыпу сведчыць пра магчымасць пранікнення ў рэгіён носьбітаў нарвенскай/постнарвенскай культурнай традыцыі. Аднак такія ўплывы, відавочна, не мелі моцнага ўздзеяння на мясцовыя супольнасці. Дадзены пункт гледжання верагодна тлумачыцца прыкладна аднолькавым узроўнем развіцця гэтых супольнасцей на тэрыторыі лясной зоны Усходняй Еўропы, для якіх была ўласціва натуральная гаспадарка.

**Заключэнне**

У выніку неабходна падсумаваць сведчанні месца супольнасцей ляснога неаліту ў культурных працэсах на тэрыторыі Беларускага Панямоння на прыкладзе вывучэння керамічных калекцый. Развіцце носьбітаў ранненеалітычнай прыпяцка-нёманскай культур адбывалася ў традыцыйным рэчышчы для сінхронных культур на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Аднак на кераміцы названай супольнасці зафіксаваныя і першыя нешматлікія адбіткі лінейнага штампа, што з'яўляюцца сведчаннямі пранікнення ў рэгіён традыцый культуры лейкападобных кубкаў. Менавіта пад уплывам «лейкападобнікаў» складваецца ранні этап нёманскай культуры. Далейшае развіццё мясцовага насельніцтва адбывалася пад уплывам культуры шарападобных амфар, што праявілася ў далейшым развіцці звычая загладжвання знешняй паверхні, аздаблення ў выглядзе лінейнага штампу і трубчастай арнаментацыі. На развіццё традыцый «шарападобнікаў» у пэўнай ступені наклаўся больш моцны ўплыў з боку кола культуры шнуравой керамікі. Менавіта пад уздзеяннем «шнуравікоў» (з другой чвэрці 3 тысячагоддзя да н.э.) неабходна разглядаць з'яўленне ў мясцовым асяроддзі звычая апрацоўкі знешняй паверхні пучком травы, ад чаго заставаліся сляды падштрыхоўкі. Альтэрнатыўны шлях развіцця

познанеалітычнага мясцовага насельніцтва прадстаўлены ў кераміцы, якая адносіцца да некласічных матэрыялаў нёманскай культуры з наяўнасцю слядоў ад ужывання «расліннасці» пры вырабе пасудзін. Такім чынам, развіццё мясцовага насельніцтва ляснога неаліту адбывалася пад моцным уплывам цэнтральнаеўрапейскіх культур. Культурныя кантакты з носьбітамі ляснога неаліту з больш паўночных рэгіёнаў абумовілі з'яўленне нарвенскага/постнарвенскага кампаненту на тэрыторыі Беларускага Панямоння.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Зуева, А. У. Культура шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі і яе роля ў развіцці супольнасцяў III – пачатку II тысячагоддзя да н.э. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.06 / А. У. Зуева. – Мінск, 2011. – 24 с.

2. Исаенко, В. Ф. Неолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 128 с.

3. Крывальцэвіч, М. М. Матэрыялы неаліту і бронзавага веку з Беларусі ў фондах Варшаўскага археалагічнага музея / М. М. Крывальцэвіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – Вып. 14. – С. 68–82.

4. Крывальцэвіч, М. М. Беларускае Палессе ў перыяд пераходу ад неаліту да эпохі бронзы: праблемы і перспектывы археалагічнага вывучэння / М. М. Крывальцэвич // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski / red. A. Kośko. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 137–162.

5. Лакіза, В. Позні неаліт, ранні і сярэдні перыяды бронзавага веку Паўночна-Заходняй Беларусі. Стан і перспектывы даследаванняў / В. Лакіза // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski / red. A. Kośko. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 99–119.

6. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 344 с.

7. Ткачоў, А. Кераміка ляснога неаліту з тэрыторыі Беларускага Пабужжа / А. Ткачоў // Супольнасці каменнага і броназвага вякоў міжрэчча Віслы і Дняпра : зб. навук. арт. памяці Міхала Чарняўскага / уклад. В. У. Ашэйчык [і інш.]. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2015. – С. 143–164.

8. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 142 с.

9. Чарняўскі, М. М. Культура шарападобных амфар / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал.: М. В. Біч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / М. М. Чарняўскі [і інш.]. – С. 211–219.

10. Чарняўскі, М. М. Нёманская культура / М. М. Чарняўскі, У. Ф. Ісаенка // Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал.: М. В. Біч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / М. М. Чарняўскі [і інш.]. – С. 145–170.

11. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларусі : праблемы перыядызацыі і храналогіі / М. М. Чарняўскі // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski / red. A. Kośko. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 99–118.

12. Чарняўскі, М. М. Выявы птушак на кераміцы ў першабытнай культуры Беларусі / М. М. Чарняўскі // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2008. – Vol. III. – С. 67–76.

13. Чарняўскі, М. М. Кераміка ўсвяцкай культуры: набыткі апошніх палявых сезонаў / М. М. Чарняўскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 ліст. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 115–122.

14. Чарняўскі, М. М. Нёманская неалітычная культура ў Беларусі: генезіс і эвалюцыя / М. М. Чарняўскі // Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu / pod red. U. Stankiewicz, A. Wawrusiewicza. – Białystok, 2011. – S. 77–86.

15. Юрецкий, С. С. К проблемам в изучении неолита Северо-Западной Беларуси / С. С. Юрецкий // Древности Средне-Западной России и сопредельных территорий : материалы XXX междунар. студ. археол.-этнолог. конф., Брянск, 22–24 мая 2014 г. – Брянск : РИО БГУ, 2014. – С. 84–92.

16. Юрэцкі, С. С. Да праблемы культурнай ідэнтыфікацыі неалітычных старажытнасцей Беларускага Панямоння (гістарыяграфічны агляд) / С. С. Юрэцкі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 25. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – С. 141–150.

17. Юрэцкі, С. С. Узаемадзеянне традыцый у лясным неаліце Беларускага Панямоння на прыкладзе вывучэння керамікі / С. С. Юрэцкі // Древности Средне-Западной России и сопредельных территорий : материалы XXXI междунар. студ. археол.-этнолог. конф., Брянск, 21–23 мая 2015 г. – Брянск : РИО БГУ, 2015. – С. 66–76.

18. Jażdżewski, K. Kultura pucharów lejkowatych w Polsce zachodniej i środkowej / K. Jażdżewski. – Poznań : Nakł. Polskiego Tow-wa Prehistorycznego, 1936. – 457 s.

19. Hołubowicz, W. Stanowisko kultury pucharów lejkowatych koło wsi Zanarocze w woj. Wileńskim / W. Hołubowicz // Z otchłani wieków. – 1939. – № 5–6. – S. 159–165.

20. Kurzawa, J. Zagadnienie najwczesnejszych faz kultury ceramiki sznurowej na Nizinie Wielkopolsko-Kujawskiej: problem tła genetycznego społeczności kultury pucharów lejkowatych / J. Kurzawa // Poznań : Wyd-wo Un-tu im. A. Mickiewicza, 2001. – 382 s.

21. Szmyt, M. Between West and East. People of the Globular Amphora Culture in Eastern Europe : 2960-2350 BC / M. Szmyt. – Poznań, 1999. – 350 p.

22. Wawrusewicz, A. Taksonomiczne podstawy identyfikacji tradycji kultury pucharów lejkowatych w środowisku strefy leśnej Europy Wschodniej. Perspectywa subneolitu kontynentalnego / A. Wawrusewicz // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 18 / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – С. 131–146.

23. Wawrusiewicz, A. Okres neolitu i wczesnej epoki brązu na Podlasiu. Stan i perspektywy badań / A. Wawrusiewicz // Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu / pod red. U. Stankiewicz i A. Wawrusiewicza. – Białystok, 2011. – S. 87–101.

24. Wawrusiewicz, A. Ceramika typu Sokołówek na Podlasiu i jej znaczenie w rozwoju społeczności subneolitycznych Polski Północno-Wschodniej / A. Wawrusiewicz // Studja i materiały nad neolitem i wczesną epoką brązu na Mazowszu i Podlasiu. – Warszawa, 2013. – T. III. – S. 49–94.

25. Wawrusiewicz, A. Ceramika wczesnoneolityczna na Podlasiu. Przyczynek do badań nad genezą kultury niemeńskiej / A. Wawrusiewicz // Супольнасці каменнага і бронзавага вякоў міжрэчча Віслы і Дняпра : зб. навук. арт. памяці Міхала Чарняўскага / уклад. В. У. Ашэйчык [і інш.]. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2015. – С. 123–140.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.03.2016

***Yuretski S.S.* The Location of the Forest Neolithic Communities of the Belarusian Poniemen in the System of Cultural Relations (as an Example Ceramics)**

*Ceramics is the main source for the population study of the Neolithic Age on the territory of Belarus. As an example the ceramic collections of the forest Neolithic monuments of the Belarusian Poniemen managed to trace a number of signs that indicate the influence of several cultural traditions (the Central European Neolithic and neighboring cultures of the forest Neolithic). The strongest impact was experienced by the population of the Neman culture in its early and classical stages of development from the Central European cultures. Evidence for the presence of traditions of the neighboring forest Neolithic cultures on the territory of Belarusian Poniemen has much less pronounced.*